**Патрабаванні да выканання задання па беларускай мове**
**(здача кандыдацкага экзамена па спецыяльнасці)**

**дацэнта Пятровай Н. Я.**

Паважаныя дактаранты, аспіранты і саіскальнікі!

Для здачы кандыдацкага экзамена па спецыяльнасці Вам неабходна выканаць наступнае заданне па беларускай мове:

1. Пераклад урыўка з уласнага навуковага артукула па тэме дысертацыі з рускай мовы на беларускую. У выпадку адсутнасці ўласных артыкулаў, перакладайце любы навуковы тэкст па тэме дысертацыі. Аб'ём урыўку павінен быць не менш за 1000 знакаў, пажадана старонка надрукаванага тэксту А$^4$, шрыфт 14, інтэрвал адзінарны. **У рабоце трэба мець надрукаваны варыянт тэксту на рускай мове і <u>рукапісны</u> пераклад на беларускую мову**. На экзамене быць гатовым вусна перакладаць з рускай мовы на беларускую гэты ці іншы навуковы тэкст па тэме, блізкай да дысертацыйнага адаследавання.

2. На беларускай мове скласці і надрукаваць рэзюмэ па тэме дысертацыі па наступнай схеме:

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара.
2. Тэма дысертацыі.
3. Ключавыя словы (не менш за 7).
4. Мэта работы.
5. Метады даследавання.
6. Выкарыстаная апаратура.
7. Навізна.
8. Асноўныя вынікі.
9. Практычная значнасць (ступень выкарыстання).

На экзамене быць гатовым вусна ахарактарызваць уласнае дысертацыйнае даследаванне на беларускай мове.

Падрыхтаваная і раздрукаваная работа здаецца на праверку дацэнту Пятровай Наталлі Яўгеньеўне не пазней за 3 дні да даты кандыдацкага экзамена (работу прыносіць па раскладу заняткаў або дамовіцца аб сустрэчы па тэлефоне  +375 29 6545196).